**22.** Выберыце з прапанаваных назоўнікі, якія ў форме роднага склону маюць канчатак ***-у(-ю)***.

*1) тыдзень; 2) поспех; 3) турнір.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**23.** Частка слова, якая стаіць пасля кораня і служыць для ўтварэння новых слоў – … .

**А)** прыстаўка. **Б)** суфікс. **В)** канчатак. **Г)** нулявы канчатак. **Д)** аснова.

---

**24.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску напішаце літару ***й***?

*1) за..граць; 2) па..менна; 3) без..менны; 4) дэз..нфекцыя.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**25.** Дадзены словы:

*1) узлесак; 2) азёрны; 3) ляціць; 4) іду.*

У якіх з гэтых слоў правільна падкрэслена аснова?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**26.** Якія назоўнікі з прапанаваных з'яўляюцца нескланяльнымі?

*1) канферансье; 2) кенгуру; 3) стрэмя.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**27.** Выберыце з дадзеных назоўнік(-і) ніякага роду:

*1) клішэ; 2) каноэ; 3) поні.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

---

**28.** Якая назва птушкі прапушчана ў народнай прыказцы?

*Дзе сава і …, там носа не тыч.*

**А)** сініца. **Б)** варона. **В)** цецярук. **Г)** сыч. **Д)** драч.

---

**29.** Што ў народзе называюць цыганскім сонцам?

**А)** кола. **Б)** месяц. **В)** хмары. **Г)** зоркі. **Д)** неба.

---

**30.** Назва гэтых кіславатых, але добрых лекавых ягад прыйшла са старажытных часоў і даслоўна перакладаецца з лацінскай мовы як "кіслы шарык". Ягадныя кусты, якія вельмі любяць вільготныя месцы, могуць дажыць да ста гадоў. Якую назву маюць ягады?

**А)** ажыны. **Б)** маліны. **В)** журавіны. **Г)** брусніцы. **Д)** чарніцы.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
КОНКУРС
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 3. Тыраж 19800 экз. 2023 г.

# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры
# «БУСЛІК-2023»

*Чацвер, 16 лютага 2023 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Колькі ўсяго слоў у сказе?

*Адцямнаідасвітанкуборспяваекалыханку.*

**А)** 5. **Б)** 6. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 9.

---

**2.** Дадзены народныя выразы:

*1. Слова можа параніць і можа загаіць.*
*2. Работа не бясчэсціць, а мацуе і цешыць.*
*3. Добрая слава ў кошыку ляжыць, а благая слава па дарожцы бяжыць.*

Вызначце просты(-ыя) сказ(-ы).

**А)** 1. **Б)** 1, 2. **В)** 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

---

**3.** Якія літары з прапанаваных супадаюць у напісанні ў рускай і беларускай мовах?

*1) и; 2) ь; 3) ш; 4) ў.*

**А)** усе літары. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**4.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце змякчальны мяккі знак (**ь**)?

*1) павіл..ён; 2) дз..мухавец; 3) ноч..; 4) гладз..; 5) лаз..ня.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**5.** Вызначце на дадзеных малюнках тую(-ыя) выяву(-ы), у пачатку назвы(-аў) якой(-іх) ёсць ***[ж]***.

1)  2)  3)  4) 

**А)** 1. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**6.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі Якуба Коласа.

*Сыпле іней на бярозы,*
*Туліць дрэвы лёгкім пухам,*
*Крые руні, травы, лозы*
*Белай воўнаю-кажухам.*

Падлічыце колькасць слоў, якія маюць ***[х]***.

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**7.** Дадзены словы:

*1) падаконнік; 2) каменне; 3) бясстрашнасць; 4) калоссе.*

У якіх з гэтых слоў адбылося падаўжэнне зычных?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 2, 4.

---

**8.** Выберыце з прапанаваных прыкладаў назвы тыпаў маўлення.

*1) паслядоўнасць; 2) апавяданне; 3) звязнасць;*
*4) разважанне; 5) апісанне; 6) тэматычнае адзінства.*

**А)** 1, 2, 4. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 3, 6. **Г)** 2, 4, 5. **Д)** 3, 5, 6.

---

**9.** Якому ўстойліваму спалучэнню адпавядае значэнне ‘быць у добрых сяброўскіх адносінах’?

**А)** на шырокую нагу. **Б)** быць на роўнай назе.
**В)** ног не чуць пад сабой ад радасці. **Г)** траціць зямлю пад нагамі.
**Д)** ісці нага ў нагу.

---

**10.** Выберыце з прапанаваных правільнае(-ыя) сцвярджэнне(-і).

*1. Пачатковая форма назоўніка – форма назоўнага склону множнага ліку.*
*2. Спалучэнне дзейніка і выказніка з’яўляецца словазлучэннем.*
*3. Пры змяненні слова ўтвараюцца формы гэтага ж слова, яго лексічнае значэнне не змяняецца.*

**А)** 1. **Б)** 1, 2. **В)** 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

---

**11.** У выразах “згубіліся” дзеясловы:

*1. Адною рукою і вузла … . 2. Іх і вадою … .*
*3. За стол не спяшайся, з-за стала … .*

“Адшукайце” дзеясловы і вярніце на месца ў выразы.

*а) не марудзь; б) не завяжаш; в) не разальеш.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-а, 3-в. **Г)** 1-б, 2-в, 3-а. **Д)** 1-в, 2-б, 3-а.

---

**12.** Вызначце з прапанаваных словы, у якіх на месцы пропуску напішаце літару ***ы***.

*1) ш..калад; 2) ш..рсцяны; 3) ч..ставік; 4) гл..ток.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**13.** Дадзены назоўнікі:

*1) кальe; 2) вальера; 3) курьер; 4) куцюрье.*

Выберыце тыя з іх, якія напісаны правільна.

**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**14.** Словы, якія маюць адно лексічнае значэнне, называюцца … .

**А)** сінонімамі. **Б)** амонімамі. **В)** антонімамі.
**Г)** адназначнымі. **Д)** мнагазначнымі.

---

**15.** Вызначце схему, дзе правільна аформлены сказ з простай мовай.

*1) “П”! – а. 2) А – “П”. 3) “П?” – а.*

**А)** усе схемы. **Б)** няма такой схемы. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**16.** У якіх словах з прапанаваных першы гук ***[й]***?

*1) яслі; 2) небакрай; 3) елка; 4) айва.*

**А)** няма такіх слоў. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**17.** Дадзены словы на рускай мове:

*1) мечтатель; 2) волшебник; 3) фонарь; 4) зонт.*

Вызначце іх адпаведнікі на беларускай мове:

*а) ліхтар; б) летуценнік; в) парасон; г) чарадзей.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-в, 3-г, 4-а. **В)** 1-б, 2-г, 3-а, 4-в.
**Г)** 1-в, 2-а, 3-г, 4-б. **Д)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а.

---

**18.** Назоўнік ***аброць*** мае значэнне … .

**А)** ‘лодка, зробленая з аднаго кавалка дрэва’.
**Б)** ‘дзежка з вушкамі і векам, звычайна для захоўвання прадуктаў і рэчаў’.
**В)** ‘паляўнічая сумка для дзічыны’.
**Г)** ‘частка збруі, якая надзяваецца каню на галаву’.
**Д)** ‘месяц у апошняй квадры, на зыходзе’.

---

**19.** Колькі займеннікаў (калі паўтараюцца, лічыць за адзін) у вершаваных радках З. Бядулі?

*Гэй, мой конік, гэй, мой сівы!*
*Танканогі, даўгагрывы!*
*Галавою страсяні,*
*Капытамі зазвіні!*
*І далёка, мілы мой,*
*Паімчымся мы з табой.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**20.** Дадзены назвы птушак на рускай мове:

*1) селезень; 2) ястреб; 3) индюк; 4) филин.*

Якая назва мае адпаведнік у беларускай мове ***ка́чар***?

**А)** няма такой назвы. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**21.** Прачытайце ўважліва народныя выразы:

*1) адной рукой і вузла не завяжаш; 2) вакол крам, ды зноў к нам;*
*3) гультаю хоць тры дні не есці, абы з печы не злезці;*
*4) дораг не абед, а добрае слова.*

Якому выразу адпавядае значэнне ‘вярнуцца ні з чым’?

**А)** няма такога выразу. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.